Источник: **«Звязда» - 2013-02-27**

# Пайшоў з жыцця вядомы генканструктар аўтатэхнікі Міхаіл Высоцкі



**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў сувязі са смерцю акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, выдатнага вучонага і канструктара, грамадскага дзеяча, Героя Беларусі Міхаіла Высоцкага накіраваў спачуванні яго жонцы, родным, блізкім і калегам. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

**Як адзначаецца ў спачуванні, Міхаіл Высоцкі заслужыў прызнанне і аўтарытэт не толькі як таленавіты даследчык і кіраўнік, але і як сумленны, прынцыповы і справядлівы чалавек. Яго смерць — гэта незаменная страта для беларускай навукі.**

Міхаіл Сцяпанавіч Высоцкі вядомы як выдатны канструктар, які стварыў айчынную школу канструявання і даследаванняў грузавых аўтамабіляў, вядомы вучоны ў галіне механікі і комплекснага праектавання мабільных машын. З імем Міхаіла Высоцкага звязаны найбольш значныя дасягненні Мінскага аўтазавода: распрацоўка прынцыпова новай кампаноўкі вялікагрузных аўтамабіляў "кабіна над рухавіком", стварэнне канцэптуальнага модульнага аўтацягніка МАЗ-2000 "Перабудова", які атрымаў залаты медаль на Парыжскім салоне аўтамабілебудавання ў 1988 годзе, стварэнне шасці пакаленняў магістральных аўтапаяздоў .

Міхаіл Высоцкі апублікаваў больш за 450 навуковых прац. Ім атрымана 145 аўтарскіх пасведчанняў і патэнтаў, большасць з якіх паслужылі асновай для павышэння канкурэнтаздольнасці і стварэння новых відаў аўтатрактарнай тэхнікі. Міхаілам Высоцкім падрыхтавана 6 дактароў, 18 кандыдатаў навук і створана беларуская школа механікі і комплекснага праектавання мабільных машын, якая атрымала шырокае міжнароднае прызнанне. Міхаіл Высоцкі ўзнагароджаны дзяржаўнымі прэміямі СССР (1970) і БССР (1986). Яму прысвоены ганаровыя званні "Заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі БССР" (1976) і "Заслужаны работнік прамысловасці СССР" (1991). Канструктар узнагароджаны ордэнамі: Працоўнага Чырвонага Сцяга (1967), Леніна (1974), Айчыны III ступені (1998) і II ступені (2004). У 2002 годзе ён атрымаў падзяку Уладзіміра Пуціна за ўзорнае выкананне воінскага абавязку і самаадданае служэнне Айчыне. У 2006 годзе ўказам Прэзідэнта Беларусі Міхаілу Высоцкаму прысвоена званне "Герой Беларусі". У 2008 годзе яму аб'ўлена падзяка кіраўніком дзяржавы за шматгадовую плённую, высокаэфектыўную навукова-тэхнічную дзейнасць.